# Пройдзе філатэлістычная выстаўка «Брэст-2024»

З 26 ліпеня па 4 жніўня 2024 года ў Брэсце пройдзе філатэлістычная выстаўка «Брэст-2024»

Пад эгідай 80-годдзя вызвалення Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў экспазіцыя выстаўкі аб'яднала калекцыі 85 удзельнікаў з 13 краін: Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Ізраіля, Кыргызстана, Латвіі, Марока, Малдовы, Польшчы, Расіі, Сербіі, Славакіі і ЗША.

Да гэтай падзеі РУП «Белпошта» падрыхтавала мастацкі маркіраваны канверт з літарнай маркай «А».

Дызайн праекта Алены Мядзведзь.

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне памятны спецштэмпель, які будзе выкарыстоўвацца з 26 ліпеня па 4 жніўня 2024 года для правядзення спецыяльнага памятнага гашэння, прымеркаванага да філатэлістычнай выстаўкі «Брэст-2024».

Месца гашэння – аддзяленне паштовай сувязі № 10 Брэста.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/proydze-filatelistychnaya-vystauka-brest-2024*